*Анисович Антон Брониславович*

**«Жанчыне вайны»**

Быў месяц чэрвень мірным і гарачым,
Убіралася ў калоссе збажына.
Не разумеў я ад чаго матуля плача,
Пачуўшы з рэпрадуктара: «Вайна!»

Яна стаяла ў роспачы і горы,
Адна, з дзяцьмі без бацькі, без радні.
Прызвалі мужа па вясне на зборы
І ў першыя прапаў без весткі дні.

Вайна катком прайшлася па Айчыне,
Пераламала лёсы ўсіх людзей.
Мужчын павыбівала. А жанчыне –
Салдаткай стаць і паднімаць дзяцей.

Перажыла вайну ў акупацыі,
Не здрадзіла, ад гора не зламалася.
Не верыла хлусні і агітацыі
І з дзецьмі Перамогі дачакалася.

Сцярпела, вытрывала, надарвала сілы...
Мы перад ёю ў даўгу ўсе вечным.
Жанчын вайны – жывых і ў магілах –
Мы будзем помніць і ўслаўляць сардэчна!